11. *Тихомиров, М. Н.* Россия в XVI столетии / М. Н. Тихомиров. – М.: Изд-во АН СССР, 1962. – 583 с.
12. *Базилевич, К. В.* Внешняя политика Русского централизованного государства: вторая половина XV века / К. В. Базилевич. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1952. – 542 с.
13. *Греков, И. Б.* Очерки по истории международных отношений Восточной Европы XIV–XVI вв. / И. Б. Греков. – М.: Изд-во Вост. лит., 1963. – 374 с.
14. *Хорошкевич, А. Л.* Русское государство в системе международных отношений конца XV – начала XVI в. / А. Л. Хорошкевич. – М.: Наука, 1980. – 293 с.
15. *Зимин, А. А.* Россия на рубеже XV–XVI столетий: очерки социально-политической истории / А. А. Зимин. – М.: Мысль, 1982. – 333 с.
16. *Зимин, А. А.* Россия на пороге нового времени: очерки политической истории России первой трети XVI в. / А. А. Зимин. – М.: Мысль, 1972. – 452 с.
17. *Семенова, Л. Е.* Из истории молдавско-польско-турецких отношений конца XV в. / Л. Е. Семенова // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв./ под ред. Б. А. Рыбакова. – М.: Наука, 1979. – С. 40–52; *Семенова, Л. Е.* Некоторые аспекты международного положения Молдавского княжества во второй половине XV в. / Л. Е. Семенова // Юго-Восточная Европа в средние века: сб. / редкол.: чл.-кор. АН СССР Я. С. Гросул [и др.]. – Кишинев: Штиинца, 1972. – С. 225–234.
18. *Банёнис, Э. Д.* Посольская служба Великого Княжества Литовского (середина XV в. – 1569 г.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 00.07.02 / Э. Д. Банёнис; Ин-т истории АН Литвы. – Вильнюс, 1982. – 21 с.
19. *Думин, С. В.* Другая Русь (Великое княжество Литовское и Русское) / С. В. Думин // История Отечества: люди, идеи, решения. Очерки истории России IX–XX вв. / сост. С. В. Мироненко. – М.: Политиздат, 1991. – С. 76–126.
20. Очерки внешнеполитической истории Молдавского княжества (последняя треть XIV – начало XIX в.). – Кишинев: Штиинца, 1987. – 464 с; *Параска, П. Ф.* Молдавско-литовские отношения во второй половине XIV–XV в. (опыт ретроспективного анализа источников) / П. Ф. Параска // Проблемы источниковедения истории Молдавии периода феодализма и капитализма. – Кишинев: Штиинца, 1983. – С. 43–61.
21. *Jablonowski, H.* Westrussland zwischen Wilna und Moskau. Die politische Stellung und die politischen Tendencen der russischen Bevölkerung des Grossfürstentums Litauenim 15. Jh. / H. Jablonowski // Studien zur Geschichte Ost Europas. – Leiden: Brill, 1955. – 167p.
22. Historia dypłomacji Polskiej (połowa X–XX w.): w 5 t. / Polski Institut Spraw Międzynarodowych; pod red. G. Łabudy. – Warszawa: PWN, 1982. – T. 1: Połowa X w. – 1572 / M. Biskup, K. Gorski, Z. Kaczmarczyk, G. Łabuda, Z. N. Nowak, K. Zelewski; pod red. M. Biskupa. – 875 p.
23. *Zelewski, R.* Słuzba dypłomatyczna litewska w zestawieniu z koronną / R. Zelewski // Historia dypłomacji polskiej. – Warszawa: PWN, 1982. – T. 1, cześć 7. – P. 786–788.
24. *Bardach, J.* Ryskun i Spieg (z dziejow służby wywiadawczej w Wielkim Księstwie Litewskim XVI stulecia) / J. Bardach // Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVI wieku / J. Bardach. – Warszawa: PWN,1970. – P. 391–418.
25. *Kosman, M.* Historia Białorusi / M. Kosman. – Wrocław etc.: Ossolineum, 1979. – 425 p.
26. *Ochmański, J.* Historia Litwy / J. Ochmański. – Wrocław etc.: Ossolineum, 1990. – 395 p.
27. *Pietkiewicz, K.* Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiellonczyka. Studia nad dziejami państwa i spoleczeństwa na przełomie XV i XVI wieku / K. Pietkiewicz. – Poznań: Wyd-wo Naukowe UAM, 1995. – 256 p.
28. *Грыцкевіч, А. П.* Венскі кангрэс 1515 года / А. П. Грыцкевіч // Францыск Скарына і яго час: энцыкл. давед. / БелСЭ. – Мінск: БелСЭ, 1988. – С. 280; *Грыцкевіч, А. П.* Гісторыя геапалітыкі Беларусі / А. П. Грыцкевіч // Спадчына. – 1994. –№ 1. – С. 85–93; *Грыцкевіч, А. П.* Міжнародныя адносіны ва Усходняй Еўропе ў XV–XVI стст. / А. П. Грыцкевіч // Францыск Скарына і яго час: энцыкл. давед. / БелСЭ. – Мінск: БелСЭ, 1988. – С. 419–420.



29. *Грыцкевіч, А. П.* Бітва пад Оршай 8 верасня 1514 года / А. П. Грыцкевіч // Спадчына. – 1992. – № 6. – С. 2–11.
30. *Кананові, У. І.* Дыпламатыя Вялікага княства Літоўскага ў 1480 – першай чвэрці XVI ст. (адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам): дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / У. І. Кананові. – Мінск, 1997. – 95 л.
31. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / АН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с.

**(Дата подачи: 18.02.2015 г.)**

*Р. І. Попель*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*R. I. Popel*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94**

# НЕКАТОРЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ЎКРАІНСКІХ ЗЕМЛЯЎ XV–XVII СТАГОДДЗЯЎ У ГАЛОЎНЫМ АРХІВЕ СТАРАЖЫТНЫХ АКТАЎ У ВАРШАВЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ ПОЛЬШЧЫ

# SOME SOURCES ON HISTORY OF UKRAINIAN LANDS 15th – 17th CENTURIES IN THE CENTRAL ARCHIVES OF HISTORICAL RECORDS IN WARSAW AND IN THE NATIONAL LIBRARY OF POLAND

*У артыкуле разглядаюцца некаторыя крыніцы па гісторыі ўкраінскіх земляў XV–XVII стст., якія захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве і Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы. Гэтыя дакументы могуць быць выкарыстаны ў даследаваннях па гісторыі Украіны, а таксама гісторыі Беларусі і іншых краін Усходняй Еўропы.*
*Ключавыя словы: крыніцы па гісторыі Украіны; гісторыя Украіны; Вялікае Княства Літоўскае; Рэч Паспалітая; Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве; Нацыянальная бібліятэка Польшчы; гісторыя Усходняй Еўропы.*

*In the article the brief review of some primary sources is presented on history of Ukrainian lands of 15th – 17th centuries, kept in the Central Archives of Historical RecordsinWarsaw andinthe National Library of Poland. These documents can be used in research on the history of Ukraine, as well as the history of Belarus and other countries in Eastern Europe.*
*Key words: primary sources on the history of Ukraine; history of Ukraine; Grand Duchy of Lithuania; Polish-Lithuanian Commonwealth; Central Archives of Historical Records in Warsaw; National Library of Poland.*

Украінскія зямлі – Кіеўшчына, Валынь, Усходняе Падолле, Чарнігаўская і Ноўгарад-Северская землі – сталі часткай Вялікага Княства Літоўскага пасля перамог над татарамі і войнаў за галіцка-валынскую спадчыну ў XIV ст. Чарнігаўшчына і Севершчына пасля войнаў першай паловы XV ст. былі далучаны да сваіх валоданняў Маскоўскай дзяржавай, а астатнія ўкраінскія землі ВКЛ у 1569 г. адыйшлі ў склад Польшчы. Галічына і Заходняе Падол-

ле перайшлі да Польскай Кароны яшчэ падчас войнаў за галіцка-валынскую спадчыну. Усё гэта робіць тагачасную гісторыю ўкраінскіх земляў шчыльна звязанай з гісторыяй краін Усходняй Еўропы – Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі і інш.

Розныя аспекты гісторыі ўкраінскіх земляў XIV–XVII стст. разглядалі ў сваіх працах А. Антановіч, М. Грушэўскі, Ф. Шабульда, А. Русына, Н. Якавенка, Г. Літвін, Е. Выразумскі, Я. Качмарчык, Я. Куртыка і інш. [1]. Аднак заўважым, што «літоўскі» перыяд украінскай гісторыі ніколі не прыцягваў такой значнай увагі даследчыкаў, як гісторыя Старажытнай Русі ў больш раннім храналагічным прамежку ці гісторыя казаччыны ў пазнейшы перыяд. Гісторыя ўкраінскіх земляў у складзе Польшчы таксама захоўвае шмат «белых плямаў». Пры гэтым колькасць звернутых у навуковы абарот, тым больш сур'ёзна даследаваных гістарычных крыніц па гісторыі ўкраінскіх земляў (асабліва ў складзе ВКЛ) да першай паловы – сярэдзіны XVI ст. з'яўляецца зусім невялікай. Не з'яўляюцца ўключанымі ў актыўны навуковы абарот і дастаткова шмат крыніц пазнейшага гістарычнага перыяду. У гэтым святле вялікі патэнцыял захоўвае праца з архіўнымі і бібліятэчнымі зборамі шэрагу еўрапейскіх краін.

У дадзеным артыкуле разглядаюцца некаторыя крыніцы па гісторыі ўкраінскіх земляў XV–XVII стст., што захоўваюцца ў двух буйных зборах сталіцы Польшчы – Варшавы: у Галоўным архіве старажытных актаў (Archiwum Główne Akt Dawnych, далей AGAD) і Нацыянальнай бібліятэцы (Biblioteka Narodowa, далей BN). Намі не ставіцца ўсёабдымная задача адносна поўнага пераліку адпаведных крыніц у дадзеных зборах ці іх падрабязнага апісання. Аднак мы хацелі б зрабіць кароткі агляд некаторых дакументаў па гісторыі ўкраінскіх земляў XV–XVII стст. у AGAD і BN, на якія, на наш погляд, было б варта звярнуць непасрэдную ўвагу даследчыкам падобнай тэматыкі.

У AGAD крыніцы па гісторыі ўкраінскіх земляў размешчаны ў розных зборах і аддзелах – Зборы пергаменавых дакументаў 1155–1939 гг. (Zbiór Dokumentów Pergaminowych 1155–1939), Зборы папяровых дакументаў 1455–1931 гг. (Zbiór Dokumentów Papierowych zlat 1455–1931), Варшаўскім архіве Радзівілаў – аддзелы II, V і інш. (Archiwum Warszawskie Radziwiłłów – Dz. II, V і інш.), Варшаўскім Каронным архіве 1455–1796 гг. (Archiwum Koronne Warszawskie zlat 1455–1796) і г. д. У BN прадстаўлены дакументы (у асноўным у выглядзе мікрафільмаў) з розных сучасных і гістарычных бібліятэк Польшчы. Матэрыялы, што датычацца гісторыі ўкраінскіх земляў у позняе Сярэднявечча і ранні Новы час, можна знайсці ва ўласных калекцыях BN, а таксама зборах з бібліятэк Польскай акадэміі навук у Кракаве (Polska Akademia Nauk w Krakowie), Акадэміі ведаў у Кракаве (Akademia Umiejętności w Krakowie), Ягелонскай бібліятэкі ў Кракаве (Biblioteka Jagiellońska), Курніцкай бібліятэкі (Biblioteka Kórnicka) і інш. Размяркуем некаторыя цікавыя для нас крыніцы згодна з іх тэрытарыяльнай прывязкай да той ці іншай зямлі, а таксама ў адпаведнасці з тыпам гістарычнай крыніцы.



Пачнем з Кіеўскай зямлі – самай вялікай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі тагачаснай Украіны. Важную групу крыніц тут складаюць вялікакняскія прывілеі, а таксама лісты ад гаспадароў ВКЛ, што скіраваны да мясцовых ураднікаў. Вельмі цікавы для нас прывілей вялікага князя Літоўскага Жыгімонта II Аўгуста ад 5 мая 1558 г. гораду Кіеву, што захоўваецца ў AGAD, Archiwum Warszawskie Radziwiłłów – Dz. V. Згодна з прывілеем па просьбе мяшчан Жыгімонт Аўгуст вызваліў іх ад новага падатку «в тутошнем панстве нашом великом кнѧзстве литовском на наймоване подвод под послы и гонцы наши» [2]. У гэтым жа прывілеі вялікі князь аддае загад кіеўскаму ваяводзе Рыгору Хадкевічу пра стварэнне спецыяльнага рэестру ўсіх фурманаў і перавозчыкаў. Дадзены прывілей добра ўпісваецца ў тагачасныя знешне- і ўнутрыпалітычныя кантэксты гісторыі паўднёвых валоданняў ВКЛ. З аднаго боку, прывілей адлюстроўвае захады ўрада ВКЛ па рэфармаванні войска і павышэнні эфектыўнасці перасоўвання людзей і грузаў ва ўмовах пастаянных татарскіх нападаў на ўкраінскія землі і сітуацыі пачатку Інфлянцкай вайны. З іншага боку, дадзены прывілей дазваляе лепш разумець узаемаадносіны паміж кіеўскімі мяшчанамі, мясцовымі палітычнымі элітамі і цэнтральнымі ўладамі ВКЛ.

Сярод іншых дакументаў, што зыходзілі ад гаспадароў ВКЛ, можна прыгадаць ліст Жыгімонта I да на дадзены момант ужо не існуючага манастыра Св. Мікалая Пустынніка ў Кіеве. Гэты дакумент, што быў датаваны 9 верасня 1513 г., зараз захоўваецца ў зборах BN [3]. Галоўны сэнс яго зместу – зацвярджэнне каралеўскіх наданняў манастыру. У працяг тэматыкі ўзаемаадносін вялікакняскай улады з кіеўскімі манастырамі ўспомнім ліст 1564 г. Жыгімонта II Аўгуста да спраўцы Кіеўскага ваяводства Івана Чартарыйскага са збораў Ягелонскай бібліятэкі (у выглядзе мікрафільма ў BN). Дакумент па сутнасці ўяўляе сабой мандат вялікага князя з дазволам Івану Чартарыйскаму ўрэгуляваць канфлікт паміж манастыром Св. Мікалая Пустынніка і Кіева-Пячорскім манастыром [4]. Дарэчы, на мандаце стаіць подпіс вядомага палітычнага дзеяча ВКЛ падскарбія земскага, маршалка дворнага Астафія Валовіча.

Ад гаспадарскіх прывілеяў і лістоў, адрасаваных у Кіеўскую зямлю, пяройдзем да кароткага агляду справаздач і рэляцый мясцовых ураднікаў. Тут трэба назваць копію рэляцыі з інфармацыяй пра стан спраў у Крымскім ханстве («Ардзе Перакопскай»), што была складзена Янам Малікам, адпраўленым у якасці пасла да хана. Справаздача адрасавана Юрыю Мікалаевічу, прозвішча якога не ўпамінаецца. Хутчэй за ўсё, гэта князь Радзівіл, вялікі гетман літоўскі [5]. Дакумент не датаваны, але, напэўна, ён быў складзены ў 1536 г. ці ў 1537 г. Да гэтай жа групы крыніц можна аднесці і завераныя ў 1553 г. копіі двух лістоў. Першы з іх – ліст Жыгімонта II

Аўгуста да паноў-рады ВКЛ, дзе, акрамя разгляду пытання пра адпраўленне пасольства да Івана IV, таксама даецца адказ на ліст кіеўскага ваяводы Фрыдэрыка Пронскага пра татарскую пагрозу і ўмацаванне замка ў Белай Царкве. Тут жа знаходзіцца загад Пронскаму адправіць паслоў да крымскага хана з мэтай утрымання татараў ад далейшых нападаў, а таксама пачаць збор шляхты. Другі ліст – ад ваяводы Фрыдэрыка Пронскага да Жыгімонта Аўгуста – утрымлівае звесткі пра татарскую пагрозу і збіранне шляхты для камплектавання войска [6]. Усе тры названыя намі лісты знаходзяцца ў AGAD, Archiwum Warszawskie Radziwiłłów – Dz. II.

Сярод крыніц, што датычацца непасрэдна ўнутранага жыцця Кіеўскага ваяводства ўжо ў часы Рэчы Паспалітай, успомнім дакумент за 24 чэрвеня 1571 г. са Збора папяровых дакументаў AGAD. Згодна з тэкстам дакумента, падсудак Кіеўскага павета Тэадор Тыша пацвярджае атрыманне кіеўскім харужым Шчасным Харлінскім 150 злотых на харугву Мікалая Драговіча згодна з каралеўскім распараджэннем [7].

Значную частку крыніц па гісторыі ўкраінскіх земляў XV–XVII стст. складае ліставанне афіцыяльных і прыватных асоб, у тым ліку арыстакратычных родаў. Адной з найбуйнейшых магнацкіх дынастый ва Украіне, ВКЛ і ранняй Рэчы Паспалітай былі князі Астрожскія, чыя дзейнасць мае непасрэднае дачыненне да гісторыі розных украінскіх земляў – Валыні, Кіеўшчыны, Падолля. Так, у AGAD, Archiwum Warszawskie Radziwiłłów – Dz. II, захоўваюцца тры лісты князя Іллі Астрожскага, брацлаўскага і вінніцкага старасты, сына вядомага палкаводца князя Канстанціна Астрожскага. Два лісты можна датаваць 25 красавіка і 2 мая 1539 г., трэці быў напісаны каля 1540 г. Першы з іх, дарэчы, быў адрасаваны вялікаму князю Жыгімонту I і паведамляў пра небяспеку татарскіх нападаў [8].

Аб'ёмнае ліставанне другога сына Канстанціна Астрожскага князя Канстанціна Васіля Астрожскага, што быў кіеўскім ваяводам, уладзімірскім старастай і маршалкам Валынскай зямлі, наогул з'яўляецца адной з самых вялікіх груп крыніц па гісторыі ўкраінскіх земляў тых часоў. У AGAD знаходзіцца вялікая калекцыя дакументаў, што звязаны з К. В. Астрожскім, у тым ліку збор з яго 81 ліста за 1562–1602 гг. (Archiwum Warszawskie Radziwiłłów – Dz. V) [9]. У Зборы папяровых дакументаў у AGAD захоўваецца арыгінал цікавага дакумента, дадзенага ў Вільні 22 кастрычніка 1562 г. У ім Жыгімонт II Аўгуст загадвае кіеўскаму ваяводзе К. В. Астрожскаму пад закладам 20 тысяч коп літоўскіх грошай перадаць дзяцей і ўласнасць памерлага князя Януша Заслаўскага Рыгору Хадкевічу, троцкаму кашталяну, які згодна з тэстаментам нябожчыка быў прызначаны іх апекуном [10]. У BN можна прагледзець ліст К. В. Астрожскага да царкоўнага і грамадскага дзеяча Ісаі Балабана (прыкладна 1559 г.), подпісы князя стаяць пад маёмаснымі распараджэннямі 1585 г. і 1600 г. [11]. Гэта, безумоўна, толькі частка з захаваных лістоў вядомага князя.



Дайшла да нашага часу і эпісталярная спадчына Аляксандра Астрожскага, валынскага ваяводы, пераяслаўскага старасты і сына К. В. Астрожскага. У AGAD, Archiwum Warszawskie Radziwiłłów – Dz. V знаходзіцца калекцыя з 14 яго лістоў за 1578–1601 гг. [12]

Сярод ліставання іншых асоб са збораў AGAD, Archiwum Warszawskie Radziwiłłów – Dz. V, што маюць дачыненне да гісторыі Кіеўскай зямлі, таксама ўспомнім два лісты кіеўскага ваяводы Рыгора Хадкевіча за 1555 г. і 1568 г. Тут жа захоўваецца карэспандэнцыя царкоўнага і палітычнага дзеяча ВКЛ і Рэчы Паспалітай каталіцкага епіскапа Кіеўскага Мікалая Паца, што прадстаўлена ў выглядзе 9 яго лістоў за 1565–1589 гг. [13].

Адмысловай гістарычнай крыніцай са збораў Ягелонскай бібліятэкі, што ў выглядзе мікрафільма маецца ў BN, з'яўляецца копія XVIII ст. размежаванняў Кіеўскага ваяводства з Крэменецкім і Мазырскім паветамі [14]. Гэты дакумент мае асаблівае каштоўнасць, калі ўлічыць, што вызначэнне дакладных межаў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак гістарычных дзяржаў нярэдка з'яўляецца складанай справай з-за недастатковай асветленасці ў крыніцах.

Калі звярнуцца да некаторых дакументаў па гісторыі Валынскай зямлі, то тут трэба зноў успомніць пра значную дакументальную спадчыну князёў Астрожскіх, што мелі на Валыні вялікія латыфундыі, а шэраг прадстаўнікоў гэтага роду былі валынскімі ваяводамі. Своеасаблівую групу крыніц па гісторыі ўкраінскіх земляў адпаведнага перыяду складае ліставанне з Крымскім ханствам, а таксама справаздачы пра стан спраў у гэтай дзяржаве. Для прыкладу назавём хаця б ліст бея Мустафы да караля Стэфана Баторыя за 1578 г. пра татарскую выправу на валынскі Астрог з AGAD, Archiwum Koronne Warszawskie z lat 1455–1796 [15].

Сярод крыніц гаспадарчага характару па гісторыі Валыні прыгадаем добра захаваны дакумент ад 2 кастрычніка 1571 г. У адпаведнасці з ім княгіня Ганна Сангушка сведчыць пра адданне збора з пэўных тавараў у Валынскай зямлі [16]. Зазначым, што княгіня Ганна – прадстаўніца роду Бранковічаў, апошняй уладарнай дынастыі Сербскай дэспатавіны (адсюль і адмысловае «імя па бацьку» Ганны – «Дэспатаўна»). Яна з'яўлялася жонкай маршалка Валынскай зямлі, уладзімірскага, а пазней – вінніцкага і брацлаўскага старасты Фёдара Сангушкі і маці польнага гетмана ВКЛ і брацлаўскага старасты Рамана Сангушкі. Зараз дакумент знаходзіцца ў Зборы папяровых дакументаў AGAD.

Цікавы дакумент, што сведчыць як пра гісторыю Усходняга Падолля, так і пра гісторыю роду князёў Вішнявецкіх, мы можам знайсці ў Зборы пергаменавых дакументаў AGAD. Гэта грамата, у якой кароль Польшчы Ян I Ольбрахт абяцае вярнуць у адпаведны тэрмін пазыку князю Міхаілу Вішнявецкаму [17], брацлаўскаму намесніку, які, дарэчы, лічыцца заснавальнікам свайго знакамітага роду. Выдатна захаваны лацінамоўны дакумент датуецца 26 чэрвеня 1500 г. Такім чынам, гэты ліст

можна аднесці фармальна яшчэ да XV ст., а колькасць крыніц па гісторыі ўкраінскіх земляў у складзе ВКЛ гэтага перыяду невялікая. У той ці іншай ступені закранаюць гісторыю Падолля і шэраг дакументаў роду князёў Астрожскіх.

Значную групу крыніц па гісторыі ўкраінскіх земляў у позняе Сярэднявечча і ранні Новы час складаюць дакументы па гісторыі Галічыны і Заходняга Падолля – рэгіёнаў, якія яшчэ з часоў войнаў за галіцка-валынскую спадчыну знаходзіліся ў складзе Польскага Каралеўства. Прыгадаем два прыклады дакументаў па эканамічнай гісторыі Галіччыны. У першым з іх, датаваным канцом XIV – пачаткам XV ст., паведамляецца, што перамышльскі суддзя Костка Балестрашыцкі здае каралю Уладзіславу I Ягайле справы пра збор падаткаў у Перамышльскай, Яраслаўскай, Ланцуцкай і Жэшуўскай валасцях [18]. Дакумент знаходзіцца ў Зборы папяровых дакументаў AGAD.

У BN захоўваюцца мікрафільмы са збораў Акадэміі ведаў у Кракаве, якія ўяўляюць сабой вялікую калекцыю рукапісных дакументаў Львоўскага манетнага двара – 270 аркушаў за 1526–1666 гг. [19]. Пры гэтым зазначым, што да XVI ст. тут адносяцца толькі лічаныя дакументы, большая іх частка была створана ў 1650–1660-я гг. Многія дакументы ўтрымліваюць інфармацыю пра працу манетнага двара ў надзвычайных умовах падчас аблогі Львова маскоўскімі і казацкімі войскамі ў 1655 г.

Зроблены намі агляд адлюстроўвае толькі пэўную частку крыніц па гісторыі ўкраінскіх земляў XIV–XVII стст. у варшаўскіх зборах. Актыўная навуковая праца з гэтымі, а таксама пошук новых гістарычных крыніц могуць не толькі высветліць многія пытанні ўкраінскай гісторыі, але і дапамагчы ў вывучэнні гісторыі Беларусі і іншых краін Усходняй Еўропы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Антонович, В. Б.* Киев, его судьба и значение с XIV по XVI столетие / В. Б. Антонович // Моя сповідь: Вибрані історичні та публіцистичні твори / упор. О. Тодійчук, В. Ульяновський; вст. ст. та коментарі В. Ульяновського. – К.: Либідь, 1995. – 816 с.; *Грушевський, М.* Історія України-Руси: в 11 т., 12 кн. / редкол.: П. С. Сохань (голова) [та ін.]. – Київ: Наук. думка, 1991. – Т. IV: XIV – XVI віки. Відносини політичні. – 540 с.; *Шабульдо, Ф. М.* Земли юго-западной Руси в составе Великого Княжества Литовского в 20–90-х гг. XIV в.: автореф. … канд. ист. наук / Ф. М. Шабульдо. – К., 1983. – 25 с.; *Русина, О. В.* Україна під татарами і Литвою / О. В. Русина // Україна крізь віки: у 13 т. – К.: Альтернативи, 1998–1999. – Т. 6. – 1998. – 320 с.; *Яковенко, Н. М.* Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII століття. Волинь і Центральна Україна / Н. М. Яковенко. – Київ: Наук. думка, 1993. – 416 с. (2-ге вид., переглянуте і виправлене: Київ: Критика, 2008. – 472 с.); *Litwin, H.* Równi do równych: kijowska reprezentacja sejmowa 1569–1648 / H. Litwin. – Warszawa: Wydwo DiG, 2009. – 195 s.; *Kurtyka, J.* Podole pomiędzy Polską i Litwą w XIV i pierwszej połowie XV wieku / J. Kurtyka // Kamieniec Podolski / E. Kiryk. – Kraków, 2000.

2. 6 мая 1558 г. Прывілей Жыгімонта Аўгуста мяшчанам горада Кіева // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Archiwum Radziwiłłów. – Dział V. – Sygnatura 3306.

3. 1513 г. Ліст Жыгімонта I Старога да манастыра Св. Мікалая Пустынніка ў Кіеве з зацвярджэннем каралеўскіх наданняў манастыру // Biblioteka Narodowa (Warszawa). – Rękopisy. – Sygnatura III. 3085.

4. 1564 г. Ліст Жыгімонта II Аўгуста Івану Чартарыйскаму пра ўрэгуляванне канфлікту паміж манастыром Св. Мікалая Пустынніка і Кіева-Пячорскім манастыром // Biblioteka Narodowa (Warszawa). – Mikrofilmy. – Mikrofilm 43080.

5. [1536/7] Рэляцыя пра падзеі ў Крымскім ханстве да Юрыя Мікалаевіча (Радзівіла?) // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Archiwum Radziwiłłów. – Dział II. – Sygnatura 3293.

6. 1553 г. Ліставанне Жыгімонта II Аўгуста і кіеўскага ваяводы Фрыдэрыка Пронскага пра татарскую пагрозу (копіі двух лістоў) // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Archiwum Radziwiłłów. – Dział II. – Sygnatura 3302.

7. 24 чэрвеня 1576 г. Падсудак Кіеўскага павета Тэадор Тыша пацвярджае атрыманне грошай на ўтрыманне харугвы // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Zbiór Dokumentów Papierowych z lat 1455–1931. – Sygnatura 4364.

8. [1539–1540 гг.] Ліставанне Іллі Астрожскага (3 лісты) // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Archiwum Radziwiłłów. – Dział II. – Sygnatura 3296.

9. 1562–1602 гг. Ліставанне Канстанціна Васіля Астрожскага (81 ліст) // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Archiwum Radziwiłłów. – Dział V. – Sygnatura 11078.

10. 22 кастрычніка 1562 г. Ліст Жыгімонта II Аўгуста да Рыгора Хадкевіча пра апякунства над дзецьмі нябожчыка Януша Заслаўскага // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Zbiór Dokumentów Papierowych z lat 1455 1931. – Sygnatura 4495.

11. [1559? г.] Ліст Жыгімонта II Аўгуста да Ісаі Балабана // Biblioteka Narodowa (Warszawa). – Mikrofilmy. – Mikrofilm 37611. – K. 7–8; 1585 і 1600 гг. Маёмасныя дыспазіцыі з подпісамі Канстанціна Васіля Астрожскага // Biblioteka Narodowa (Warszawa). – Mikrofilmy. – Mikrofilm 1544.

12. 1578–1601 гг. Ліставанне Аляксандра Астрожскага (14 лістоў) // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Archiwum Radziwiłłów. – Dział V. – Sygnatura 11074.

13. 1555 і 1568 гг. Ліставанне Рыгора Хадкевіча (2 лісты) // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Archiwum Radziwiłłów. – Dział V. – Sygnatura 2045; 1565–1589 гг. Ліставанне Мікалая Паца (9 лістоў) // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Archiwum Radziwiłłów. – Dział V. – Sygnatura 11213.

14. 1566, 1609, 1622 гг. Размежаванні Кіеўскага ваяводства з Крэменецкім і Мазырскім паветамі (копія XVIII ст.) // Biblioteka Narodowa (Warszawa). – Mikrofilmy. – Mikrofilm 40938.

15. [1578? г.] Ліст татарскага бея Мустафы да Стэфана Баторыя // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Archiwum Koronne Warszawskie z lat 1455–1796. – Sygnatura 24503.

16. 2 кастрычніка 1571 г. Ганна Сангушка сведчыць пра адданне збора з пэўных тавараў у Валынскай зямлі // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Zbiór Dokumentów Papierowych z lat 1455–1931. – Sygnatura 3283.

17. 26 чэрвеня 1500 г. Ліст Яна I Ольбрахта, у якім ён абяцае вярнуць пазыку князю Міхаілу Вішнявецкаму // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Zbiór Dokumentów Pergaminowych 1155–1939. – Sygnatura 5240.

18. [1386–1418 гг.] Перамышльскі суддзя Костка (Балестрашыцкі) здае каралю Уладзіславу I Ягайле справы пра збор падаткаў // Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa). – Zbiór Dokumentów Papierowych z lat 1455–1931. – Sygnatura 4480.

19. 1526–1666 гг. Калекцыя дакументаў Львоўскага манетнага двара (270 аркушоў) // Biblioteka Narodowa (Warszawa). – Mikrofilmy. – Mikrofilm 29336.


**(Дата подачи: 19.02.2015 г.)**